ўвасабляюцца ўмоўныя нотныя знакі ў канкрэтным скрыпічным, цымбальным, домравым, фартэпіянным або аркестравым гучанні.

***Зыгмантовіч С.В.***, дацэнт
***Саітава В.І.***, дацэнт

# РОЛЯ АГУЛЬНАБІБЛІЯГРАФІЧНЫХ КУРСАЎ У ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ

Навучанне студэнтаў па агульнабібліяграфічных дысцыплінах з'яўляецца складаным шматгранным адукацыйна-выхаваўчым працэсам, пабудаваным на двухбаковай узаемазвязанай дзейнасці выкладчыка і студэнтаў. Вызначальнымі ўмовамі гэтай дзейнасці становяцца мэты навучання (адукацыйныя і выхаваўчыя); змест вучэбнага матэрыялу і матывы вучэбнай дзейнасці студэнтаў. Гэтыя ўмовы цесна ўзаемазвязаны. Мэты навучання вызначаюць змест. Матывы вучэбнай дзейнасці аказваюць значны ўплыў на актыўнасць студэнтаў, іх адносіны да авалодвання ведамі, уменнямі і навыкамі выканання бібліяграфічных працэсаў і аперацый. У сваю чаргу матывы фарміруюцца ў працэсе навучання і выхавання студэнтаў, залежаць ад арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, метадаў і прыёмаў выкладання і зместу вучэбнага матэрыялу. Ад мэт навучання і выхавання залежаць характар дзейнасці выкладчыка і студэнтаў, арганізацыйныя формы і метады правядзення заняткаў, асаблівасці зваротных сувязей у навучанні.

Мэта дадзенага артыкула заключаецца ў тым, каб прааналізаваць складаючыя вучэбна-выхаваўчага працэсу пры выкладанні асобных дысцыплін агульнабібліяграфічнага цыкла, прасачыць іх уплыў на прафесіяналізацыю студэнтаў-завочнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыфіка выкладання агульнабібліяграфічных курсаў на завочным аддзяленні вызначаецца перш за ўсё асаблівасцямі студэнцкага кантынгенту. Абсалютная большасць студэнтаў працуюць у бібліятэках на участках, звязаных з абслугоўваннем чытачоў, фарміраваннем фондаў. Сярод працуючых мала бібліёграфаў. Таму ў свядомасці навучэнцаў часта існуе стэрэатып: "Я бібліёграфам не буду". Аб гэтым сведчаць назіранні і прыватныя гутаркі, вынікі даследаванняў. Гэтая ўстаноўка ўзнікае пад уплывам такіх відавочных фактараў, як невялікая колькасць пасад бібліёграфаў у бібліятэках, складанасць бібліяграфічнай працы.

Таму адной з выхаваўчых мэт агульнабібліяграфічных курсаў з'яўляецца пераадоленне адзначанага стэрэатыпу ў студэнтаў. Важна паказаць, што валоданне бібліяграфічнымі метадамі неабходна для кожнага работніка бібліятэкі незалежна ад займаемай пасады і месца працы, што ва ўмовах інфармацыйнага грамадства, калі інфармацыя стала важнейшым рэсурсам, змяняецца канцэптуальны падыход да ацэнкі дзейнасці бібліятэкі. Менавіта бібліятэкі пераўтвараюцца ва ўстановы, дзе, вобразна кажучы, супрацоўнікі, якія могуць знайсці патрэбную інфармацыю і па-за сценамі сваёй бібліятэкі, становяцца важней фондаў.

Гэтую матывацыйную накіраванасць мы стараемся сфарміраваць у студэнтаў ужо ва ўводных лекцыях па курсах "Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы ў бібліятэцы" АТБР і "Бібліяграфічнае краязнаўства". Яна рэалізуецца і ў працэсе выкладання большасці раздзелаў і тэм, напрыклад такіх як бібліяграфічныя працэсы ў небібліяграфічных падраздзяленнях; функцыянальнае прызначэнне і магчымасці выкарыстання бібліяграфічных рэсурсаў на розных участках, у розных працэсах бібліятэчнай работы і г.д.

Пры выкладанні кожнай спецыяльнай дысцыпліны выкладчык павінен дакладна вызначыць яе ролю ў прафесійным станаўленні студэнтаў і адпаведна вызначыць змест навучання, формы, метады, характар прафесійных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зносін выкладчыка і студэнтаў. А роля бібліяграфічных курсаў далёка не аднолькавая ў агульным вучэбна-выхаваўчым працэсе. Пры вывучэнні адных курсаў пераважна рэалізуецца задача першапачатковага знаёмства студэнтаў і засваення імі ведаў, навыкаў і ўменняў бібліяграфічнай работы, пры вывучэнні другіх фарміруюцца навыкі даследчыцкай дзейнасці.

Менавіта першая агульнадыдактычная задача вырашаецца ў працэсе выкладання курса АТБР.

Прафесійная падрыхтоўка бібліятэкараў-бібліёграфаў немагчымая без грунтоўнага засваення імі арганізацыйных пытанняў бібліяграфічнай дзейнасці; структуры, арганізацыі і сучаснага стану ДБА бібліятэкі; засваення асноўных аперацый і працэсаў бібліяграфавання бібліяграфічнага абслугоўвання; работ па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў. Гэтыя пытанні і вызначаюць змест курса АТБР, які рэалізуецца ў працэсе лекцый, семінарскіх і лабараторных заняткаў.

Пры вызначэнні зместу лекцый па названым курсе галоўная задача выкладчыка заключаецца ў тым, каб адабраць матэрыял, які дапаможа студэнту сістэмна ўявіць той ці іншы накірунак бібліяграфічнай дзейнасці, тэхналагічны працэс, засяродзіць увагу на найбольш ключавых і складаных аспектах тэмы. Адначасова студэнта трэба вучыць, як самастойна авалодваць ведамі.

Лабараторныя работы даюць магчымасць набыць практычныя ўменні і навыкі па аналізе бібліяграфічных крыніц (прычым з многімі крыніцамі студэнты знаёмяцца ўпершыню), ажыццяўленні бібліяграфічных аперацый і працэсаў.

Па спецыяльна распрацаваных крытэрыях-алгарытмах студэнты аналізуюць бібліяграфічныя крыніцы розных відаў, якія паступаюць у даведачна-бібліяграфічны фонд бібліятэкі. На падставе аналізу яны набываюць больш дакладныя ўяўленні аб складзе, характары крыніц бібліяграфічнай інфармацыі, іх вартасцях і недахопах. Адначасова лабараторныя работы ўключаюць і

аперацыйную або практычную частку. Пазнаёміўшыся з бібліяграфічнымі дапаможнікамі, студэнт павінен адказаць на пытанні аб іх практычным выкарыстанні. Усе практычныя пытанні разлічаны на тыповае выкарыстанне бібліяграфічных крыніц, накіраваны на фарміраванне ў студэнтаў не толькі ўяўленняў аб змесце і структуры дапаможнікаў, але найперш аб іх функцыянальных магчымасцях.

Лабараторныя заняткі, прысвечаныя канкрэтным працэсам бібліяграфічнай дзейнасці, будуюцца так, каб зарыентаваць студэнта не на выкананне асобных практычных дзеянняў, а на авалоданне цэласным алгарытмам пэўных відаў дзейнасці, ажыццяўленне на аперацыйным узроўні пэўнага бібліяграфічнага працэсу. На занятках павінны прымяняцца элементы праблемнасці, выкарыстоўвацца актыўныя метады навучання, напрыклад дзелавыя гульні з мадэліраваннем канкрэтных вытворчых сітуацый. Аднак, на жаль, вопыт іх правядзення сведчыць, што абсалютная большасць студэнтаў далучаецца да выканання розных формаў бібліяграфічнай работы ўпершыню пры навучанні ва універсітэце.

Паглыбленню бібліяграфічных ведаў, удасканаленню навыкаў і ўменняў садзейнічаюць дысцыпліны спецыялізацый, курсы па выбары. Пасля засваення студэнтамі матэрыялу курса АТБР у выкладчыкаў дысцыплін спецыялізацый ёсць магчымасць праблемна выкладаць матэрыял у кожнай лекцыі, знаёміць з перадавым вопытам работы бібліятэк, наладзіць абмен вопытам работы саміх студэнтаў. Менавіта на гэтым этапе працэс зносін выкладчыка і студэнтаў-завочнікаў характарызуецца ўзаемным узбагачэннем і ведамі, і вопытам.

У ходзе выкладання спецыяльных бібліяграфічных дысцыплін, як мы адзначалі вышэй, ставяцца і задачы фарміравання навыкаў даследчыцкай дзейнасці.

Пры выкладанні бібліяграфічнага краязнаўства выкладчык імкнецца выклікаць цікавасць да даследчай работы, сфарміраваць уменні бачыць, ставіць і вырашаць

навуковыя праблемы, у тым ліку тыя, якія ўзнікаюць у выніку дзейнасці студэнтаў па авалоданні будучай прафесіяй. Развіваць навуковыя здольнасці ў студэнтаў ФЗН вельмі няпроста. Гэта абумоўлена спецыфікай навучання. Аднак нельга забывацца на тое станоўчае, што ёсць у такой спецыфіцы. Мы маем на ўвазе працу студэнтаў-завочнікаў у бібліятэках розных рэгіёнаў.

На сучасным этапе бібліятэкі адчулі патрэбу ў бібліёграфах-краязнаўцах. Узніклі сітуацыі, калі публічным і другім бібліятэкам цяжка абраць адпаведную кандыдатуру. У чым жа прычына? Бібліёграф не толькі павінен добра валодаць усімі працэсамі краязнаўчай бібліяграфічнай работы ў бібліятэцы, уменнем весці інфармацыйны пошук па-за яе межамі. Акрамя гэтага, спецыяліст працуе максімальна эфектыўна, калі набывае глыбокія веды аб родным краі, займае актыўную пазіцыю ў іх папулярызацыі, выступае "інфармацыйным агентам" у даследчых, вучэбных і другіх калектывах, занятых вывучэннем краю. Дасягнуць такога ўзроўню могуць тыя бібліёграфы, якія маюць комплекс ведаў аб родным краі, пастаянна паглыбляюць гэтыя веды і ўмела ствараюць і выкарыстоўваюць ДБА, бібліяграфічную інфармацыю, дапамагаючы чытачам у вывучэнні асобных пытанняў. Вельмі важна, таксама на аснове краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі, умець генерыраваць спецыфічныя дакументаграфічныя веды. На падставе апошніх самі бібліёграфы і спецыялісты шэрага другіх галін могуць вырашаць новыя навуковыя задачы.

Пры выкладанні курса "Бібліяграфічнае краязнаўства" для далучэння студэнтаў да навуковай работы выкарыстоўваюцца наступныя асноўныя захады.

Паказваецца значэнне фактару сучаснай эфектыўнай арганізацыі для здзяйснення краязнаўчых бібліяграфічных даследаванняў. Сёння бібліятэкам належыць галоўная роля ў арганізацыі вывучэння роднага краю мясцовым насельніцтвам. Многія бібліятэкі стварылі на сваёй базе унікальныя інфармацыйныя цэнтры, куткі, гурткі, музеі, рознапрофільныя аб'яднанні і інш. Звяртаецца ўвага студэнтаў на тое, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

унікальныя інфармацыйныя рэсурсы ЦБС і паслугі – добрая база для яднання ўсіх удзельнікаў краязнаўчай дзейнасці ў рэгіёне.

Засяроджваецца ўвага студэнтаў на новай канцэпцыі публічных бібліятэк як цэнтраў мясцовай інфармацыі, абвешчанай у “Маніфесце ЮНЕСКА аб публічных бібліятэках, 1994”. Бібліёграфы-краязнаўцы павінны арганізаваць набыццё, бібліяграфічную апрацоўку, выкарыстанне дакументальных крыніц мясцовай інфармацыі незалежна ад носьбітаў.

Разглядаецца праблема ўдзелу бібліёграфа-краязнаўцы ў канкрэтнай умоўнай даследчай камандзе. У бібліятэках навуковых устаноў і арганізацый, музеяў, ВНУ і іншых бібліёграф як партнёр членаў даследчай каманды павінен ствараць інфармацыйнае забеспячэнне, што адпавядала б розным этапам НДР, прадбачыць нават у вузкіх тэмах уплыў міждысцыплінарных сувязей, якія з’яўляюцца характэрнымі для краязнаўчага комплексу. Для бібліёграфа – удзельніка даследчай каманды асабліва важным уменнем з’яўляецца ўменне пераводзіць на бібліяграфічную мову задачы, якія ўзнікаюць перад гэтым калектывам.

Звяртаецца ўвага студэнтаў на такі важны для даследчыка краю аспект, як крэда светапогляду, таму што для спецыялістаў, працуючых з інфармацыяй, праўда фактаў і меркаванняў павінна мець значэнне катэгорыі прафесійнага кодэкса гонару. Гэтымі паняццямі павінны кіравацца бібліёграфы-краязнаўцы, калі даводзяць да грамадскасці адкрытыя імі новыя дакументы, устаноўленыя раней невядомыя факты, удакладняюць некаторыя трактоўкі, якія існавалі да гэтага часу.

Для фарміравання элементарнай базы ведаў і ўменняў бібліёграфаў-краязнаўцаў асобнае значэнне мае тэхналагічная частка курса. Гэта абумоўлена тым, што ў любой НДР пэўныя бібліяграфічныя аперацыі складаюць арганічную частку даследаванняў і разглядаюцца ў якасці іх метадаў. Сярод бібліяграфічных працэсаў і аперацый, па меркаванні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М.В.Здабнова, найбольш развівае даследчыцкі патэнцыял спецыяліста яго майстэрства ў бібліяграфічным пошуку. Студэнты павінны добра ўяўляць, што зыходным момантам і мэтай бібліяграфічнага пошуку з'яўляецца вывучэнне канкрэтнага краю, і бачыць змястоўныя, аўтарскія, персанальныя, фармальныя сувязі дакументаў з краем. Выяўляецца кола пэўных патрабаванняў да студэнтаў, над выкананнем якіх яны пачынаюць працаваць пры вывучэнні курса і працягваць працу ў якасці бібліятэкараў-бібліёграфаў. Гэта наступныя патрабаванні:

— веданне краю, яго мінулага і гісторыі яго вывучэння,

— веданне асноўных дакументных крыніц аб краі,

— веданне асноўнага аўтарскага складу па тых ці іншых пытаннях даследавання краю,

— веданне другасных дакументальных крыніц, мясцовых і цэнтральных бібліятэк краіны, замежных бібліятэк, архіваў, музеяў па магчымым прадстаўленні ў іх фондах каштоўных дакументаў, звязаных з краем,

— уменне весці пошук у аўтаматызаваных сетках,

— уменне звязваць першасныя і другасныя дакументы з канкрэтнымі задачамі, для вырашэння якіх вядзецца бібліяграфічны пошук.

Усё гэта садзейнічае росту неабходнага для бібліёграфа-краязнаўцы ўзроўню інтэлектуальнай культуры, выяўляе асабістую зацікаўленасць і патрэбнасць у найбольш поўным і дакладным бібліяграфічным забеспячэнні кожнай пошукавай задачы запыту. Высокапрафесійны, творчы бібліёграф-краязнаўца ўсведамляе, што бібліяграфічнае адлюстраванне падзей, фактаў, што адбываліся ў краі, не часта будзе адэкватным рэальнай з'яве, і гэта становіцца добрым стымулам для паглыблення пошуку дакументаў і іх бібліяграфічнага прадстаўлення.

Усе пералічаныя накірункі далучэння студэнтаў да даследчай работы знаходзяць адлюстраванне ў тэмах лекцый і пры складанні краязнаўчых картатэк. Веды навучэнцаў, іх уменні рэалізуюцца і ўдасканальваюцца пры напісанні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

курсавых і дыпломных работ, падрыхтоўцы дакладаў на навуковыя канферэнцыі, у публікацыях саміх студэнтаў у мясцовым друку.

Выкладчыку ва ўдасканаленні прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў садзейнічае ажыццяўленне зваротнай сувязі з завочнікамі. Значнай матывацыяй для паспяховага навучання з'яўляецца патрэбнасць у атрыманых ведах, уменнях і навыках па месцы асноўнай работы студэнтаў. Лічым мэтазгодным аднавіць прадстаўленне пісьмовых водгукаў на курсавыя работы студэнтаў-завочнікаў ад кіраўніцтва адпаведнай бібліятэчна-бібліяграфічнай установы. Небеспадстаўным уяўляецца і вопыт асобных ВНУ, якія просяць у кіраўнікоў бібліятэк прадставіць вытворчыя характарыстыкі для студэнтаў, дзе б адзначалася, як навучанне ў ВНУ адбіваецца на іх працоўнай дзейнасці. Гэта тым больш актуальна ва ўмовах фарміравання канцэпцыі новай бібліятэчнай культуры, дзе падкрэслена арыентацыя бібліятэкі на чытача. Кіраўнік бібліятэкі павінен быць зацікаўлены ў рэалізацыі ўсяго патэнцыялу сваіх кадраў і ствараць умовы для гэтага, а бібліятэкар павінен адчуваць адказнасць за ўсю бібліятэку.

Для павышэння эфектыўнасці фарміравання прафесійных якасцей у студэнтаў-завочнікаў выкладчыкам спецыяльных дысцыплін трэба весці пастаянны пошук новых формаў заняткаў, іх тэматыкі, прымяняць дзелавыя гульні, аўтаматызаваныя тэхналогіі, больш увагі надаваць курсавым і дыпломным работам, пашырэнню іх тэматыкі, яе актуалізацыі, павышэнню іх практычнай значнасці.

Своечасовым будзе ўвядзенне на ФЗН спецыялізацыі "бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ